Коба Т.А., студ. гр. 414 ФТБКіСМ
БДУ культуры і мастацтваў
Навуковы кіраўнік – Персіцкая Ю.Д.,
кандыдат мастацтвазнаўства

**БЕЛАРУСКАЕ ВЯСЕЛЛЕ: ТРАДЫЦЫІ І СУЧАСНАСЦЬ**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вяселле - гэта абрад яднання, злучэння маладых, пачатак новай сям'і і адначасова - працяг старажытнага чалавечага роду.

Вясельны абрад, які склаўся на тэрыторыі Беларусі да заканчэння XIX стагоддзя, быў з'явай даволі складанай як у структурным, так і ў змястоўным плане, але пры гэтым вельмі маляўнічым, паэтычным, эмацыянальна напружаным і магічна насычаным. Ён увабраў у сябе вялікую колькасць рэгіянальных асаблівасцей, абумоўленых культурным ландшафтам плямёнаў, якія прымалі ўдзел у фарміраванні беларускага этнасу (крывічы, дрыгавічы, радзімічы, паляне). Вясельныя абрады адлюстравалі саслоўную структуру беларускага грамадства: сялян, шляхты і магнатаў. Сем'і ствараліся толькі са згоды бацькоў.

Сучаснае вяселле значна трансфарміравалася, відазмянялася. З вясельнага рытуалу выпалі вельмі драматычныя і эмацыянальныя звычаі і абрадавыя дзеянні, такія, як расплятанне касы нявесты, акручэнне яе ў галоўны ўбор замужняй жанчыны. Такі ж лёс напаткаў абрады і звычаі, звязаныя з першай шлюбнай ноччу маладых.

Зараз для таго, каб стварыць сям'ю, не трэба згоды бацькоў. Моладзь сама вырашае за каго пайсці замуж, альбо з кім ажаніцца. Аўтарытэтная функцыя бацькоў згубіла свой дальнейшы сэнс.

Па сённяшні дзень на вяселлях захоўваецца абрад выкрадання нявесты, калі патрабуюць выкуп ад гасцей з боку жаніха. Здаецца, традыцыя зберагласъ, але сэнс яе змяніўся. Грошы зараз адыйшлі на другі план, у значнай большасці

пануе гульнявы характар. Маладому устройваюць конкурсы рознага характару, такім чынам, ён даказвае сваё каханне да маладой.

Засталіся ў сённяшнім варыянце святкавання вяселля і шматлікія праваслаўныя традыцыі, якія цесна перапляліся з язычніцкімі, таму даўно і ў ўспрымаюцца як правільныя.

З цягам часу афіцыйны шлюб практычна ва ўсіх сваіх дэталях і нюансах правядзення "згуртаваў" вялікую колькасцю прымет і рэгламентацый, звязаных з даўняй традыцыйнай культурай, з народным светаўспрыманнем, ментальнасцю. У народнай культуры беларусаў у адносінах да шлюбнага абраду быў сфарміраваны цэлы шэраг рытуальна-магічных дзеянняў, забарон і прадпісанняў, накіраваных на забеспячэнне шчаслівага шлюбу маладых, іх здароўя, нараджэння дзяцей, сямейнага дабрабыту, плёну ў іх гаспадарчай дзейнасці.

Важным атрыбутам вопраткі маладых з даўніх часоў з'яўляюцца абярэгі. Маладым на вопратку прышпільвалі булаўку, клалі лісце рабіны ў абутак. Пры маладой павінна была быць свянцоная на Вялікдзень соль, чырвоная стужка. Калі маладыя вянчаюцца, на іх павінны былі быць крыжы.

Па ранейшай традыцыі маладыя перад вянчаннем абручаліся пярсцёнкамі: жаніх - залатым, нявеста - срэбраным, што азначала саюз Луны і Сонца. У сучасны час маладыя выбіраюць залатыя пярсцёнкі.

Пярсцёнкі павінны былі быць з аднаго месца і не мець ніякіх малюнкаў, іх нельга было апранаць на пярчатку. Нельга выкарыстоўваць знойдзеныя пярсцёнкі, пераплаўляць бацькоўскія. Лічылася, што падзенне пярсцёнка ў момант заключэння шлюбу прадвяшчала хваробу, сведчыла аб разводзе ці смерці аднаго з маладых.

Вянчальныя пярсцёнкі нельга было даваць прымяраць сяброўкам, сёстрам – прыкметы сведчылі аб хуткіх сямейных спрэчках.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

З даўніх часоў маладая заўсёды брала прозвішча мужа. Зараз у Беларусі маладыя, якія уступаюць у шлюб, маюць права захоўваць кожны сваё прозвішча ці мець састаўное: сваё прозвішча і прозвішча мужа.

Сёння гарадскі абрад вяселля часта мала чым адрозніваецца ад аналагічнага ў сялян. Вяселле ў заможных гараджан праходзіць больш пышна і багата ў параўнанні не толькі з сялянскім, але і гарадскім вяселлем малазаможных людзей.

На вёсцы сёння часцей гуляюць вяселле ў хатах бацькоў маладых. Гаспадары старанна рыхтуюцца да яго, гатуюць і запасаюць значную колькасць ежы і піцця, упрыгожваюць хату. Гараджане ж звычайна адзначаюць вяселле ў розных месцах грамадскага харчавання – рэстаранах, сталовых, дзе за пэўную плату і ежу прыгатуюць, і памяшканне ўпрыгожаць.

У вёсцы маладая пасля вяселля звычайна пераходзіць жыць у сям’ю мужа. А ў гараджан гэтае правіла мае шмат выключэнняў: часам мужы пераходзяць жыць у сем’і сваіх жонак і ніхто іх так не абмяжоўвае ў правах, як у сялянскім асяроддзі. Сёння маладыя сем’і адразу пасля вяселля пачынаюць жыць асобна – гэта абумоўлена як сацыяльнымі нормамі і правіламі, якія за апошнія гады таксама змяніліся, так і фінансавым становішчам мужа і жонкі.

Нязменнымі застаюцца персанажы вяселля – сват са сваццяй і сябры маладых (шаферы, дружкі).

Цэнтральны момант сучаснага вяселля – дзяленне каравая, адорванне маладых. У нашых продкаў гэты рытуал быў самым маляўнічы. Выпечка каравая суправаджалася спецыяльнымі каравайнымі песнямі. Каравай, паводле народных уяўленняў – сімвал урадлівасці. Дзялілі яго з жартам, гумарам, пажаданнямі ў адрас маладых і іх бацькоў здароўя, дабрабыту, працавітасці. Гэта традыцыя працягваецца і ў нашы дні.

Папярэднічае вяселлю звычайная ці ўрачыстая рэгістрацыя шлюбу. У абрадзе рэгістрацыі шлюбу істотнае месца займаюць такія новыя элементы, як

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

уручэнне прывітальных адрасоў і памятных сувеніраў, віншаванні блізкіх і прадстаўнікоў працоўных калектываў. Ва ўрачысты акт уваходзяць народныя традыцыі: сустрэча маладых хлебам-соллю, абсыпанне жаніха і нявесты збожжам, вынас беларускага ручніка, на які становяцца маладыя ў час шлюбнай цырымоніі.

Пасля падачы заявы ў ЗАГС маладыя звычайна арганізоўваюць вечарынку для сяброў у рэстаране. Асобна сустракаюцца сяброўкі нявесты на дзявочай вечарынцы. Там маладая развітваецца з "вольным" жыццём.

Сёння нават пры афіцыйных цырымоніях многія абрады захаваліся. У ЗАГСе сцелюць ручнік, на якім стаяць жаніх і нявеста падчас цырымоніі, заручальныя пярсцёнкі ляжаць у чашы з зернем, якім абсыпаюць маладых — усё гэта звязана са старажытнымі абрадамі, якія, як верылі людзі, павінны былі забяспечыць прыбытак і росквіт сям'і.

Такім чынам, у беларускім вяселлі адлюстраваліся сацыяльныя, маральна-этычныя, рэлігійныя, забабонныя погляды народа, яго вера ў магічную сілу абрадаў, у тым ліку іх вербальнай часткі. Функцыянальнасць іх мянялася з развіццём культуры і рацыянальных ведаў.

Літаратура:

1. Агульная энцыклапедыя. Рэд. калегія : Шамякін, І. П.(гал. рэд.) і інш.-Мн.: БелСЭ, 1989. - 230 с.

2. Беларуская фалькларыстыка: Збіранне і даследаванне народнай творчасці ў 60-х гадах XIX – пачатку XXст. – Мн.: Беларуская навука, 1989. - 316 с.

3. Варфоломеева, Т. Б. Северобелорусская свадьба: Обряд, песенно-мелодические типы / Варфоломеева, Т. Б. – Мн.: Навука і тэхніка, 1988. – 224 с.

4. Васілевіч, У. А. Беларускі народны каляндар / У.А. Васілевіч. – Мн.: Беларуская навука, 1993. – 172 с.

5. Кавалёва, Р. М. Абрысы рытуальна-магічнай сферы беларускага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фальклору / Р.М. Кавалёва.– Мн.: Беларуская навука, 2005.- 143с.

6. Кавалёва, Р. М. Беларуская вусна-паэтычная творчасць. Вучэбна-метадычны комплекс / Р.М. Кавалёва. – Мн.: Беларуская навука, 2005. – 80 с.

7. Казакова, І. В. Беларуская фальклорная спадчына / І.В. Казакова.– Мн.: Вышэйшая школа , 1996. – 180 с.

Казакова, І. В. Спецыфіка беларускага абрадавага фальклору / І.В. Казакова. – Мн.: Вышэйшая школа, 1996. – 60 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ